УДК 94(476) «1941/45»

***П.С. Popaнoвіч***

# ПАДПОЛЬНАЯ БАРАЦЬБА СУПРАЦЬ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ (НА ПРЫКЛАДЗЕ ДЗЕЙНАСЦІ КАМСАМОЛЬСКА-МАЛАДЗЁЖНАЙ ПАДПОЛЬНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ в. МОТАЛЬ ІВАНАЎСКАГА РАЁНА)

Вывучэнне гісторыі Вялікай Айчыннай вайны – прыярытэтны напрамак айчыннай гістарычнай навукі. У даследаваннях з розных ідэйна-палітычных пазіцый раскрываюцца найважнейшыя пытанні партызанскай і падпольнай барацьбы на тэрыторыі Беларусі. Для больш глыбокага асвятлення падпольнай барацьбы супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў згадваюцца ўспаміны непасрэдных удзельнікаў гэтых падзей. У дадзеным артыкуле выкарыстоўваюцца матэрыялы ўспамінаў падпольшчыка Рыгора Мікітавіча Калільца, запісаныя аўтарам у 1984 г., камандзіра партызанскага атрада імя Я.Г. Макарэвіча Івана Міхайлавіча Калільца, паказана стварэнне і агітацыйна-дыверсіённая дзейнасць камсамольска-маладзёжнай падпольнай арганізацыі в. Моталь Іванаўскага раёна.

## Уводзіны

Усё далей і далей сыходзяць у гісторыю трагічныя і гераічныя падзеі Другой сусветнай вайны, а для нашага народа – Вялікай Айчыннай. Вялікай цаной дасталася Перамога савецкаму народу над фашысцкай Германіяй. Незаменныя страты панесла Беларусь: вайна забрала кожнага трэцяга жыхара нашай рэспублікі. Тэматыка развіцця руху супраціўлення на акупіраванай тэрыторыі Беларусі ў час Вялікай Айчыннай вайны, ролі партызанскага руху і падпольнай барацьбы ў разгроме нямецка-фашысцкіх захопнікаў асветлена ў айчыннай гістарыграфіі даволі падрабязна, але для больш глыбокага асвятлення падпольнай барацьбы супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў згадваюцца ўспаміны непасрэдных удзельнікаў гэтых падзей.

Да верасня 1941 г. Беларусь была акупіравана нямецкімі войскамі. На акупіраванай тэрыторыі было ўведзена новае адміністрацыйна-тэрытарыяльнае дзяленне і кіраванне. Частка тэрыторыі БССР, тэрыторыя Літвы, Латвіі, Эстоніі былі ўключаны ў склад галоўнага рэйхскамісарыята «Остланд» з рэзідэнцыяй у Рызе, падзеленага на чатыры генеральныя акругі. Тэрыторыя генеральнай акругі Беларусь («Генеральбецырк Беларутэнія»: Баранавіцкая, Вілейская, Мінская (без усходніх раёнаў), паўночныя раёны Брэсцкай, Пінскай і Палескай абласцей) склала 90 тыс. км$^2$ – прыкладна 1/3 тэрыторыі БССР. Паўднёвыя раёны БССР увайшлі ў склад рэйхскамісарыята «Украіна» [1, с. 244].

Арганізацыя партызанскага руху і падпольнай барацьбы на акупіраванай тэрыторыі з першых дзён ваеннага нападу Германіі на СССР стаяла ў цэнтры ўвагі вышэйшых дзяржаўных і партыйных органаў улады. Згодна з дырэктывай СНК і ЦК УКП(б) ад 29.06.1941 г. і пастановай ЦК УКП(б) ад 18.07.1941 г. арганізацыя партызанскай і падпольнай барацьбы была ўскладзена на партыйныя камітэты, органы НКУС СССР.

На разгортванне узброенай партызанскай барацьбы і падпольнай дзейнасці ў гарадах і іншых населеных пунктах Беларусі арыентавала Дырэктыва № 1 ЦК КП(б)Б ад 30 чэрвеня 1941 г. аб пераходзе на падпольную работу партарганізацый раёнаў, занятых ворагам, «у мэтах кіраўніцтва дзейнасцю партызанскіх атрадаў і дыверсійных груп у раёнах, занятых ворагам, для барацьбы з часцямі варожай арміі, для распальвання партызанскай барацьбы скрозь і ўсюды, для падрыву мастоў, дарог, псавання тэлеграфнай і тэлефоннай сувязі, падпалу складоў, для стварэння нязносных умоў для ворага і яго памагатых, для зрыву ўсіх яго мерапрыемстваў» [2, с. 52].

1 ліпеня 1941 г. ЦК КП(б)Б прыняў Дырэктыву № 2 партыйным, савецкім і камсамольскім арганізацыям па разгортванні партызанскай барацьбы ў тыле ворага, у якой

ставілася задача пакрыць усю занятую нямецка-фашысцкімі захопнікамі тэрыторыю Беларусі густой сеткай партызанскіх атрадаў [1, с. 53–54]. Актывізацыі барацьбы з нямецка-фашысцкімі захопнікамі садзейнічаў заклік І. Сталіна ад 3 ліпеня 1941 г., у якім было загадана разбураць варожыя камунікацыі, знішчаць маёмасць і разгортваць усенародную барацьбу супраць ворага.

З першых дзён уступлення на тэрыторыю Беларусі нямецкіх войск пачаў устанаўлівацца «новы парадак», асновай якога была ідэя расавай перавагі нямецкай нацыі над іншымі народамі. Акупацыйны рэжым уяўляў сабой сістэму палітычных, эканамічных і ваенных мер, накіраваных на ліквідацыю дзяржаўнага ладу, рабаванне нацыянальных багаццяў, каланізацыю, зняволенне і знішчэнне насельніцтва рэспублікі.

Мэта дадзенага артыкула – выкарыстоўваючы ўспаміны непасрэдных удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, паказаць стварэнне і дзейнасць камсамольска-маладзёжнай падпольнай арганізацыі в. Моталь супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

**Стварэнне і агітацыйна-дыверсійная дзейнасць падполля**

26 чэрвеня 1941 г. у Моталь увайшла нямецкая пяхота. Быў усталяваны акупацыйны рэжым, праявамі якога былі: каменданцкі час (пасля пачатку каменданцкай гадзіны жыхар не мог выйсці за вароты свайго двара), працоўная павіннасць з 14-гадовага (пазней і з 12-гадовага) узросту, высяленне жыхароў з іх хат, жыхары павінны былі плаціць падаткі, выконваць прымусовыя пастаўкі, вываз жыхароў у Германію. Былі расклееныя загады акупацыйнай улады ўсім жыхарам здаць зброю, радыёпрыёмнікі, савецкія кнігі. У кожнай хаце павінен быў вісець спіс членаў сям'і. Расстрэл пагражаў жыхарам за ўкрыццё ваеннапалонных, акружэнцаў, партызан, за кантакты і дапамогу яўрэям. У Моталі быў створаны паліцэйскі гарнізон (пастарунак).

***З успамінаў Рыгора Мікітавіча Калільца:*** «На плошчы быў праведзены агульны сход жыхароў Моталя. Нямецкі афіцэр праз перакладчыка, каменданта паліцыі, зачытаў загады «новага парадку»: пра поўнае падпарадкаванне нямецкім акупацыйным уладам і паліцэйскаму гарнізону, што немцы з'яўляюцца найвышэйшай расай і расстрэльваюць толькі яўрэяў, камуністаў і тых, хто не падпарадкоўваецца нямецкім уладам, не здае радыёпрыёмнікі, хавае зброю і вядзе агітацыю супраць нямецкіх уладаў. Афіцэр усхваляў сілу нямецкай зброі, гаварыў, што праз месяц Масква будзе ўзятая і вайна з Расіяй скончыцца. На сходзе бургамістрам быў прызначаны М.Р. Ксёнда, а солтысам – М.А. Хала. Нямецка-паліцэйская служба на ўсіх бачных мясцінах вывесіла загады "новага парадку"» (запісана са слоў Р.М. Калільца, 28.08.1924 г. нараджэння; в. Моталь Іванаўскага раёна, 14.07.1984 г.).

Разглядаючы зараджэнне і развіццё партызанскага руху і падпольнай барацьбы на тэрыторыі Беларусі, нельга не адзначыць, што сітуацыя ў Заходняй Беларусі не была падобнай да сітуацыі ва Усходняй, дзе рух супраціўлення зарадзіўся раней і значны ўклад у яго развіццё аказалі падпольныя партыйныя структуры, якія пакідаліся пры адступленні Чырвонай Арміі. Большасць падпольных груп у Заходняй Беларусі стваралася самастойна, па ўласнай ініцыятыве тых камуністаў, што засталіся на акупіраванай тэрыторыі і не паспелі эвакуіравацца. Становішча ўскладнялася тым, што савецкая ўлада існавала ў Брэсцкай вобласці менш за два гады, частка насельніцтва станоўча ставілася да немцаў. Адсутнічала агульнае кіраўніцтва, не хапала зброі і боепрыпасаў.

Летам–восенню 1941 г. у розных рэгіёнах Беларусі незалежна адзін ад аднаго сталі ўзнікаць невялікія атрады і групы з мясцовых патрыётаў, партыйных і савецкіх работнікаў, актывістаў, ваеннаслужачых Чырвонай Арміі, якія апынуліся ў акружэнні.

***З успамінаў Р.М. Калільца:*** «13–15 ліпеня 1941 г. у наваколлі Моталя з'явілася група ў колькасці 25 чалавек, камандзірам якой быў К.Ф. Ражноў – другі сакратар Іванаўскага РК КП(б)Б. У складзе групы былі:

1. М.І. Драгацэнны – намеснік камандзіра групы;
2. С.Т. Бандарэнка – начальнік НКУС Іванаўскага раёна;
3. Т.А. Міраненка – інструктар Брэсцкага АК КП(б)Б;
4. А.Г. Кондрыкаў – сакратар Іванаўскага РК ЛКСМБ;
5. Р.Р. Гуляеў – начальнік міліцыі Іванаўскага раёна;
6. Н.Т. Стасюкевіч – участковы д. Псышчава;
7. П.Ф. Клімук – участковы в. Упірава;
8. О.Н. Туцкі – участковы г. Іванава;
9. С.С. Мінюк – участковы г.п. Моталь і іншыя.

Задача групы – арганізацыя партызанскага атрада і ўзброеная барацьба з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Зброя і боепрыпасы былі схаваныя ва ўрочышчы «Мілевіч» на мяжы Целяханаўскага і Іванаўскага раёнаў. Група размясцілася ў Моталі і вакол яго і ўстанавіла сувязь з мясцовымі падпольшчыкамі» (запісана са слоў Р.М. Калільца 14.07.1984 г.).

Летам 1941 г. першымі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў выступілі І.М. Калілец (1920 г. нараджэння, жыхар Моталя, выхадзец з сялянскай сям'і, у верасні 1939 г. удзельнічаў у паўстанні супраць польскіх улад, сакратар гарпасялковага савета ў Моталі, сакратар камсамольскай арганізацыі), С.С. Мінюк (1914 г. нараджэння, жыхар Моталя, удзельнічаў у падпольнай барацьбе супраць польскіх улад, участковы ўпаўнаважаны НКУС у Моталі). У ліпені 1941 г. у Моталі ў будынку школы адбыўся сход актывістаў і камсамольцаў, каб выпрацаваць свае далейшыя дзеянні.

***З успамінаў Івана Міхайлавіча Калільца:*** «Да вечара ў школе тайна сабраліся ўсе камсамольцы сяла. Рашэнне было аднагалосным: ісці за лінію фронту, а пакуль збіраць зброю і боепрыпасы. На другі дзень наладзілі сувязь з моладдзю навакольных вёсак. Заданне для ўсіх – узбройвацца і яшчэ раз узбройвацца» [3].

***З успамінаў Р.М. Калільца:*** «У жніўні–кастрычніку 1941 г. Іван Міхайлавіч Калілец адкрыта са зброяй паяўляўся ў Моталі і навакольных вёсках. Разам з С.С. Мінюком, І.С. Парфеяўцом з вёскі Калілы і іншымі падпольшчыкамі збіралі зброю і рыхтаваліся да адкрытай узброенай барацьбы. У клуні Мотальскага камсамольца А.К. Данілевіча правялі сход камсамольцаў. Прысутнічала каля 30 чалавек (толькі ўпаўнаважаныя, у тым ліку і з навакольных вёсак). З Моталя прысутнічалі І.М. Калілец, С.С. Мінюк, З.Д. Міховіч, А.С. Данілевіч, К.І. Ксёнда. Сход вёў К.Ф. Ражноў, які выступіў з дакладам пра надзённае становішча і задачы на будучае. Была прынята пастанова: «Да 24-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі зрываць па магчымасці мерапрыемствы нямецка-фашысцкіх акупантаў і выступіць з адкрытымі баямі» (запісана са слоў Р.М. Калільца 14.07.1984 г.).

Дапамагала І.М. Калільцу ў стварэнні падпольных груп В.Г. Міронава (1916 г. нараджэння, скончыла інстытут, па камсамольскай пуцёўцы ў 1939 г. была накіравана ў Заходнюю Беларусь наладжваць адукацыю, працавала дырэктарам школы ў Моталі).

***З успамінаў Р.М. Калільца:*** «Лепшым і верным памочнікам І.М. Калільца была Вольга Георгіеўна Міронава, ураджэнка г. Сызрань Куйбышаўскай вобласці. В.Г. Міронава ў Моталі працавала дырэктарам школы, была выдатным педагогам, здольным арганізатарам, мела павагу сярод насельніцтва Моталя, смела стала на барацьбу з ворагам. Восенню 1941 г. пачалі навучанне дзяцей у школе. Барацьбу супраць нямецкіх настаўнікаў павяла В.Г. Міронава. На запрашэнне працаваць у школе яна заявіла, што чужой фашысцкай ідэалогіі савецкіх дзяцей вучыць не будзе. В.Г. Міронава заклікала не пускаць дзяцей у школу. У нямецкую школу пайшлі да 100 дзяцей з тысячы, якім належала вучыцца. Школа праіснавала тры месяцы і закрылася. В.Г. Міронава і І.М. Калілец звярнуліся да камсамольцаў і актыву сяла Моталь з наступнымі словамі: зрываць усе мерапрыемствы нямецкіх акупантаў, не аддаваць ворагу ніводнага патрона, вінтоў-

кі, гранаты, ніводнага радыёпрыёмніка, хаваць савецкую літаратуру, зрываць нямецкія загады, растлумачваць насельніцтву выступленне І.В. Сталіна па радыё ад 3 ліпеня 1941 г., што вораг будзе абавязкова разгромлены і знішчаны, а хто здраджвае Радзіме, панясе суровую кару перад савецкім народам» (запісана са слоў Р.М. Калільца 14.07.1984 г.).

1 жніўня 1941 г. Моталь акружыў карны атрад эсэсаўцаў. Пачаліся пошукі і арышты падпольшчыкаў. Сакратара суседняга Дзедавіцкага сельскага савета У.І. Хоміча (па даносе здрадніка немцы знайшлі гранаты, некалькі вінтовак, пісталет) адразу расстралялі. Падпольшчыкам І.М. Калільцу, С.С. Мінюку, І.А. Духовічу, С.І. Палто і іншым удалося пазбегнуць арышту.

***З успамінаў І.М. Калільца:*** «Як толькі я пайшоў у партызаны, камендант Моталя Міхаіл Мінюк выдаў загад: «Усе, хто будзе хаваць Івана Калільца, будуць расстраляныя. Той, хто прывядзе яго ў камендатуру жывым ці мёртвым, атрымае 15 тысяч марак ўзнагароды» [3]. Гэта быў самы складаны і цяжкі час станаўлення мотальскага падполля. Вясной 1942 г. частка падпольшчыкаў ва ўрочышчы «Мінічы» каля в. Тышкавічы залажыла партызанскі лагер. На базе падпольных груп вёсак Моталя і Опаля пачаў стварацца партызанскі атрад.

***З успамінаў І.М. Калільца:*** «Праз сваіх верных таварышаў, што засталіся ў Моталі: Ганну Мінюк, Паўла Кульбеду, Міхаіла Пташыца, Рыгора Данілевіча, Пятра Кульбеду, Трафіма Філіповіча – група падтрымлівала цесную сувязь з насельніцтвам. Сувязныя дастаўлялі нам у лес прадукты харчавання, цёплую вопратку, зброю, боепрыпасы, перадавалі зводкі Саўінфармбюро. У падтрымцы мясцовых жыхароў была наша сіла» [3].

Для наладжвання сувязі паміж партызанамі і падпольшчыкамі ў Моталі ў былой яўрэйскай хаце была адкрыта цырульня.

***З успамінаў Р.М. Калільца:*** «З мэтай паляпшэння аператыўнасці разведкі і дзейнасці падполля па ўказанні Калільца Івана Міхайлавіча і Мінюка Сідара Сцяпанавіча ў хаце яўрэя Лейбы была адкрыта цырульня. Цырульнікам стаў падпольшчык, камсамолец Філіновіч Трафім Міхайлавіч (1922 г. нараджэння, ураджэнец Моталя, да вайны працаваў слесарам у Пінску). Гэта быў смелы, вопытны канспіратар і разведчык. У хаце, дзе знаходзілася цырульня, жыла Міронава В.Г. Цырульня стала штабам Мотальскага падполля. Партызаны атрымлівалі звесткі пра ворага. Актыўнымі ўдзельнікамі падполля былі:

1. Данілевіч Трафім Канстанцінавіч (Моталь);
2. Калілец Іван Мікітавіч (Моталь);
3. Кузюр Гаўрыла Пятровіч (Моталь);
4. Шыкалай Антон Зіноўевіч (Моталь);
5. Кульбеда Павел Іосіфавіч (Моталь);
6. Мінюк Ганна Андрэеўна (Моталь);
7. Мацукевіч Сямён Андрэевіч (Моталь);
8. Міхові Сямён Давыдавіч (Моталь);
9. Міховіч Сцяпан Сяргеевіч (Моталь);
10. Хоміч Цярэнцій Ціханавіч (Заазер’е);
11. Парфіявец Іван Сямёнавіч (Калілы);
12. Клімук Фёдар (Упірава)» (запісана са слоў Р.М. Калільца 14.07.1984 г.).

Вясной і летам 1942 г. падпольшчыкі і партызаны перайшлі да адкрытых баёў з ворагам і дыверсій:

1. У в. Моталь была спалена гміна і разгромлены маслазавод, спалена сем клунь з хлебам.

2. У в. Асаўніца забіты паліцай Мароз.

3. Пад в. Заазер’е знішчаны камендант паліцыі Грыневіч і чатыры паліцэйскія.

4. Знішчаны камендант раённай паліцыі С. Бенда. Прыехаўшы ў Моталь, ён пасяліўся ў паліцэйскім гарнізоне. Паліцэйскі (падпольшчык) Косця Яроцкі падлажыў яму ў пасцель гадзіннікавую міну.

5. У маі 1942 г. падпольшчыкі сарвалі вываз моладзі ў Германію на прымусовую працу.

6. Падпольшчыкі Аляксандр Строеў, Міхаіл Ламакін, Міхаіл Чорны 6 лістапада 1943 г. вывесілі чырвоны сцяг на будынку штаба венгерскай часці. Сцяг вісеў некалькі дзён. Ніхто не мог размініраваць сцяг. Сапёры, якія прыбылі пазней, узарвалі сцяг.

7. Падпольшчык Кузюр Г.П. (1920 г. нараджэння, стаў камсамольцам у 1940 г.) у час наступлення немцаў сабраў і схаваў 12 вінтовак і запас патронаў. Каб пазбегнуць арышту, уладкаваўся на працу ў г. Пінск і ўстанавіў сувязь з падполлем горада. Ноччу пераапранаўся ў форму нямецкага афіцэра і выконваў заданні. У снежні 1942 г. быў схоплены немцамі. Пасля допытаў расстраляны ў маі 1943 г. Вінтоўкі і патроны былі знойдзены і перададзены партызанам.

Дзейнасць падпольшчыкаў і партызан усё больш і больш непакоіла нямецкія ўлады. Умацаваўшы свае гарнізоны, немцы і паліцаі вырашылі знішчыць падполле і партызан. Пачаліся пошукі і арышты падпольшчыкаў.

***З успамінаў Р.М. Калільца:*** «Жыхарка в. Моталь Малішэўская была варожа настроена супраць Савецкага Саюза, называла беларусаў «быдлам крэсув усходніх». Пасля ўз’яднання Заходняй Беларусі з БССР працавала ў Мотальскай школе. Дырэктар школы В.Г. Міронава звольніла яе з працы за амаральнасць. У час акупацыі Моталя Малішэўская супрацоўнічала з немцамі. Яна разам з паліцэйскімі склала спіс з 56 чалавек (савецкія актывісты, камсамольцы, удзельнікі паўстання 17 верасня 1939 г.). У верасні 1942 г. у в. Заазер’е немцы і паліцаі расстралялі шэсць чалавек, а ў Моталі, каля царкоўнай агароджы, – дзесяць чалавек. У снежні 1942 г. у г. Іванава былі расстраляны маці і сястра І.М. Калільца, жонка і дзіця С.С. Мінюка, а таксама сем чалавек з Моталя: П.С. Міховіч, К.І. Ксёнда, З.Д. Міховіч, М.Д. Райкевіч, Р.А. Данілевіч, Х.А. Шыкалай, І.М. Дзяркач. У чэрвені 1942 г. па даносе Малішэўскай (у 1943 г. Малішэўскую расстралялі партызаны) была арыштавана В.Г. Міронава. Пасля допытаў яна была расстраляна 18 ліпеня 1942 г. у пінскай турме. 21 студзеня 1943 г. за сувязь з партызанамі былі расстраляны сем’і Андрэя Мінюка і Міхаіла Мінюка з Моталя» (запісана са слоў Р.М. Калільца 14.07.1984 г.).

Вясной 1942 г. сілы і вопыт падпольнай арганізацыі в. Моталь, навакольных вёсак Опаль, Упірава, Закалле, Тышкавічы і іншых дазволілі стварыць партызанскі атрад імя Я.Г. Макарэвіча, які распачаў актыўную баявую дзейнасць і стаў грознай сілай для ворагаў (у 1944 г. атрад налічваў 486 чалавек) [4, с. 187]. У канцы 1943 г. партызаны і падпольшчыкі разграмілі паліцэйскі гарнізон у Моталі. Замест нямецкай была ўтворана партызанская камендатура.

**Заключэнне**

Такім чынам, да вясны 1942 г. завяршыўся першы, самы складаны і цяжкі перыяд акупацыйнага рэжыму. Гэта быў перыяд згуртавання камсамольскай моладзі, савецкіх актывістаў, арганізацыі падполля, зрыву мерапрыемстваў акупацыйных улад, назапашвання зброі. Мотальскае камсамольска-маладзёжнае падполле, якое дзейнічала ў 1941–1943 гг., налічвала больш за 60 чалавек.

Ніякія рэпрэсіі не змаглі спыніць падпольна-партызанскай барацьбы. Спроба стварэння ў Моталі атрада нацыянальнай самаабароны (запісалася 22 здраднікі) не мела поспеху: частка была забіта партызанамі, другія – уцяклі на Захад.

Больш за 800 маталян змагаліся супраць ворага на розных франтах Вялікай Айчыннай вайны. Вопыт партызанскай і падпольнай барацьбы дапамог многім выжыць у крывавых баях з фашыстамі.

16 ліпеня 1944 г. падраздзяленні 55-й гвардзейскай стралковай дывізіі генерал-маёра А.П. Турчынскага вызвалілі Моталь. Саўінфармбюро паведаміла: «На паўночным захадзе і захадзе ад г. Пінска нашы войскі, развіваючы наступленне, авалодалі раённымі цэнтрамі Пінскай вобласці – гарадамі Янаў і Целяханы, а таксама з баямі ўзялі звыш 50 іншых населеных пунктаў, у тым ліку Тышкавічы, Моталь» [4, с. 242].

У 1975 г. у в. Моталь на будынку дзіцячай бібліятэкі ў гонар падпольшчыкаў устаноўлена мемарыяльная дошка, а ў цэнтры вёскі – помнік 187 маталянам, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Адна з мотальскіх вуліц носіць імя В.Г. Міронавай.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Неизвестная Россия. XX век : в 4-х т. – Том 4. – М. : Мосгорархив, 1993. – 512 с.
2. Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 – июль 1944) : документы и материалы : в 3-х т. – Минск : Беларусь, 1967. – Т. 1. Зарождение и развитие партизанского движения в первый период войны (июнь 1941 – ноябрь 1942). – 744 с.
3. Калилец, И. Багровое зарево / И. Калилец // Заря. – 1970. – 23 окт.– С. 4.
4. Памяць : гіст.-дакум. хроніка Іванаўскага раёна. – Мінск : БЕЛТА. – 592 с.

***Romanovich P.S.*** **Underground Fighting against German Fascist Invaders (on the example of underground organization of Motol village of Ivanovo region)**

The study of the history of the Great Patriotic war is a predominant direction of historical science. In the research the most important questions of underground and guerrilla struggle on the territory of Belarus are revealed from different ideal-political positions. The memories of immediate participants of these events are the most useful for profound elucidation of underground struggle against German-fascist invaders. In the article on the basis of the memoirs of Grigoryi Kalilets, written by the author in 1984 – a member of underground organization, Ivan Kalilets – the commander of guerrilla band named after E.G. Makarevich the organization and agitation-subversive activity of komsomol-youth underground organization of Motol village of Ivanovo region is shown.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 08.01.2014